# Новая кніга пра пінчукоў і не толькі

**Летам 2019 г. у мінскім выдавецтве «Транстэхніка» накладам усяго 50 экзэмпляраў пабачыў свет біябібліяграфічны паказальнік «Валянціна Іванаўна Локун», падрыхтаваны Брэсцкай абласной бібліятэкай ім. М. Горкага.**

**У артыкуле пісьменніка і публіцыста, тагачаснага міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь А. М. Карлюкевіча «Валянціна Локун: паказальнік зробленага» кніга атрымала высокую адзнаку.**




Разам з тым ад Алеся Мікалаевіча мы атрымалі яшчэ і прапанову выдаць кнігу ўспамінаў пра Валянціну Іванаўну. Вялікімі намаганнямі вельмі хутка былі сабраны матэрыялы і адабраны для публікацыі фотаздымкі з сямейнага архіва В. Локун.

І вось на пачатку снежня з мінскай тыпаграфіі «Белпринт» была дастаўлена ў Брэсцкую абласную бібліятэку імя М. Горкага кніга ўспамінаў «Пінск... Першамайская... Локун», прысвечаная памяці беларускага літаратурнага крытыка і літаратуразнаўцы, кандыдата філалагічных навук, члена Саюза беларускіх пісьменнікаў, старэйшага навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі В.Локун (1946–2016). Кніга выйшла накладам 99 экзэмпляраў, і сёння яе можна смела прылічыць да бібліяграфічных рэдкасцяў.

Праз успаміны блізкіх людзей, сяброў, пісьменнікаў, літаратурных крытыкаў, выкладчыкаў Брэсцкага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна раскрываецца непаўторная асоба чалавека вялікай мужнасці, высокага сумлення і выключнай чалавечай абаяльнасці.

Кнігу склалі ўспаміны тых, хто блізка ведаў Валянціну Іванаўну, быў знаёмы з яе творчасцю — чытачоў газеты «Літаратуры і мастацтва», часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Роднае слова» і «Нёман», літаратараў Пінска, Брэсцкай вобласці і ўсёй Беларусі.

Сярод аўтараў зборніка людзі розных прафесій з розных гарадоў і нават краін — яе блізкія сяброўкі, пісьменнікі і журналісты, выкладчыкі, калегі, бібліятэкары. Усе яны аб'яднаны любоўю да кнігі, да літаратуры. Сваімі ўспамінамі з чытачамі дзеляцца пісьменнікі А. Карлюкевіч і М. Пазнякоў, краязнаўца Т. Хвагіна, прафесары Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна З. Мельнікава і В. Сацінава, журналістка Н. Чайка, урач вышэйшай катэгорыі з Ізраіля Е. Голад, філолаг Г. Бажко (Вайшэвіч); пінскія літаратары М. Лаўровіч, М. Ляшук, В. Грышкавец, пісьменніца з Гродна І. Шатыронак, бібліёграф В. Гарбачэўская, літаратуразнаўца А. Шамякіна і інш.

У зборніку змешчаны таксама ўспаміны і самой Валянціны Іванаўны, напісаныя пры жыцці для розных выданняў, пра знакамітага пінскага журналіста С. Ф. Шапіру, сябра і настаўніка В. А. Каваленку, нарыс аб жыцці і творчасці В. М. Коўтун, а таксама юбілейны партрэт Т.А. Хвагінай.

Валянціна Іванаўна здолела вылучыць са свайго асяроддзя яркіх, таленавітых, высокаадукаваных прадстаўнікоў і застацца ў памяці ўсіх гэтых людзей носьбітам ідэалаў дабрыні, любові, сумлення і годнасці. Запатрабаванасць яе як літаратурнага крытыка ніколі ні ў кога не выклікала сумнення.

Вырасла ўжо не адно новае пакаленне літаратурных крытыкаў і чытачоў, але і зараз, хто б ні разгарнуў кнігу альбо часопіс з артыкулам Валянціны Іванаўны, знойдзе ў іх нешта такое, што не пакіне яго абыякавым. Сваім выпакутаваным жыццём, настойлівай і сумленнай працай у беларускім літаратуразнаўстве В. І. Локун заслугоўвае, на мой погляд, таго, каб не толькі на доме па вуліцы Першамайскай, дзе яна пражыла амаль сорак гадоў, з'явілася мемарыяльная дошка, але і адна з вуліц прыгожага і любімага горада насіла яе імя.

Спадзяёмся, што кніга ўспамінаў абавязкова з'явіцца ў бібліятэках Пінска, а пінчукі розных пакаленняў будуць ганарыцца, што менавіта ў іх горадзе жыла гэта мужная, таленавітая і працавітая жанчына.

**Валянціна ГАРБАЧЭЎСКАЯ,**
**Брэст.**